*М.Л.Кузьмініч*

# АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Развіццё тэорыі, методыкі і практыкі агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі ў канкрэтна-гістарычны перыяд залежыць ад пануючых у грамадстве філасофскіх поглядаў на ролю і месца чалавека і музычнага мастацтва ў грамадстве; ад магчымасцей музычнага мастацтва ў выхаванні асобы ва ўмовах пэўнага грамадскага ўкладу жыцця той ці іншай краіны.

Вызначэнне асноўных этапаў станаўлення музычнай адукацыі на беларускіх землях цесна звязана з развіццём сацыяльных працэсаў, з фарміраваннем у грамадстве адносін да музычнага мастацтва як важнейшай з’явы грамадскага жыцця.

Падставай для вызначэння асноўных этапаў станаўлення музычнай адукацыі на беларускіх землях з’яўляюцца наступныя палажэнні. Музычная адукацыя – шматгранная з’ява, якая выступае як арганічнае адзінства трох асноўных кірункаў: народная музычная адукацыя, рэлігійная музычная адукацыя і свецкая музычная адукацыя. У кожным з кірункаў вылучаюцца два асноўныя ўзроўні здзяйснення музычна-адукацыйнага працэсу, якія адрозніваюцца мэтамі, глыбінёй і аб’ёмам засваення розных відаў музычнай дзейнасці, музычных ведаў, уменняў і навыкаў. Адпаведна гэтым узроўням музычная адукацыя выступае ў адзінстве дзвюх падсістэм: агульнай музычнай адукацыі і прафесійнай музычнай адукацыі; іх структурныя элементы цесна ўзаемазвязаны ў кожным канкрэтна-гістарычным перыядзе. Мэта, змест і метады музычнай адукацыі ў канкрэтна-гістарычны перыяд адпавядаюць спецыфіцы музычнага мастацтва, на засваенне якога яны накіраваны; развіццё музычна-педагагічнай думкі і практыкі звязана з развіццём музычнага мастацтва на пэўным гістарычным этапе. Працэс станаўлення і развіцця музычнай адукацыі мае свае асаблівасці ў кожным з кірункаў; істотныя змены адбываюцца і ў характары ўзаемадзеяння паміж імі не толькі ў зместавым плане, але і ў плане іх іерархічнай падпарадкаванасці.

У гісторыі Беларусі можна вылучыць наступныя перыяды сацыяльна-культурнага росту грамадства і адпаведныя ім этапы станаўлення і развіцця нацыянальнай музычнай адукацыі.

1. Эпоха ранняга сярэднявечча (V–X стст.). Славянскія плямёны засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі ў V–VII стст. У гэты перыяд

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адбываюцца зараджэнне і станаўленне айчыннай мастацкай адукацыі народнай традыцыі. Вусная народная творчасць – адзін з вытокаў музычнай адукацыі – з’яўляецца спецыфічным сродкам перадачы сацыяльнага вопыту ад пакалення да пакалення. У яе традыцыйных відах адлюстраваліся адносіны народа да жыцця, нормы і правілы сацыяльных паводзін, погляды, уяўленні, перакананні. У IX–X стст. у Полацкім і Тураўскім княствах зараджаюцца традыцыі беларускай дзяржаўнасці. Хрысціянства візантыйскай традыцыі ў 988 г. становіцца афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіяй спачатку ў Кіеве, а потым распаўсюджваецца на іншыя тэрыторыі ўсходніх славян. Тым самым ствараюцца ўмовы для развіцця рэлігійнай музычнай адукацыі ў хрысціянскіх храмах.

2. XI – сярэдзіна XIII ст. У музычнай адукацыі адасабляюцца два кірункі – народнай арыентацыі і рэлігійнай (праваслаўнай) пры дамінуючай ролі апошняй. На працягу гэтага перыяду адбываюцца змены ў змесце і спосабах перадачы музычнага вопыту ад пакалення да пакалення. Узнікаюць гарады як вынік грамадскага падзелу працы і пераходу ад першабытнаабшчыннага да феадальнага ладу, як гэта назіралася ў большасці краін Еўропы. У гарадах будуюцца праваслаўныя храмы – Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку, Каложская царква ў Гародні, Благавешчанская царква ў Віцебску, манастыры і храмы ў Наваградку, Тураве. Адкрываюцца манастырскія школы, у якіх вывучаюць царкоўныя спевы.

3. Сярэдзіна XIII – канец XVIII ст. На беларускіх землях нараджаецца Вялікае княства Літоўскае. На развіццё беларускай музычнай адукацыі ўплывае Захад, усё больш адчуваецца арыентацыя на заходнееўрапейскія музычна-педагагічныя канцэпцыі і тэхналогіі. Шматканфесійны характар беларускага грамадства адлюстроўваўся ў суіснаванні і ва ўзаемаўзбагачэнні розных музычна-педагагічных сістэм. Выкарыстанне ў богаслужэбнай практыцы і вывучэнне партэснага шматгалосся спалучаецца з традыцыямі праваслаўнага хрысціянскага абраду. Вылучаюцца два новыя кірункі ў музычнай адукацыі з іх арыентацыяй на рэлігійна-духоўную (каталіцкую, праваслаўную, пратэстанцкую) і свецкую прафесійную музыку (асабліва ў эпохі Адраджэння і Асветы).

У 1770-я гг. Адукацыйная камісія адмяніла выкладанне рэлігіі ў межах школьных праграм. Цэнтрамі культурнага жыцця краю становяцца сядзібы магнатаў. Высокі прафесіяналізм дэманстравалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыватнаўласніцкія тэатры Радзівілаў, Агінскага, Тызенгаўза, Чарнышова, Зорыча. Гэта было абумоўлена тэатральнай адукацыяй, дзейнасцю музычных і балетных школ Слуцка, Слоніма, Нясвіжа, Гародні, Шклова. Прыватнаўласніцкі тэатр – з’ява свецкага мастацтва.

4. XIX – пачатак XX ст. У XIX ст. ішоў працэс інтэграцыі беларускіх зямель у Расійскую імперыю. Адзначаны перыяд характарызуецца дамінаваннем праваслаўнай рэлігіі, працэсамі русіфікацыі, увагай да народнай культуры, пашырэннем і паглыбленнем уяўленняў аб ёй. Адбываецца пераарыентацыя на тэарэтычную распрацоўку музычна-педагагічных канцэпцый, якія адпавядаюць нацыянальнай мастацкай культуры.

5. 1917–1991 гг. – станаўленне і развіццё савецкай сістэмы агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі. Для гэтага перыяду характэрны тэарэтычнае асэнсаванне музычнага мастацтва, полiварыянтнасць поглядаў на прыроду мастацтва, суіснаванне розных музычна-стылявых сістэм у межах кожнага з кірункаў развіцця музычнай адукацыі, іх узаемадзеянне і інтэграцыя. Забяспечваецца дзяржаўная падтрымка развіцця музычнай адукацыі свецкай і народнай арыентацыі. Ствараецца шматступеньчатая сістэма агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі ў межах СССР.

6. 1991 г. – да нашага часу. З атрыманнем дзяржаўнага суверэнітэту ў Беларусі ствараецца нацыянальная сістэма музычнай адукацыі, якая ўвабрала лепшыя традыцыі савецкай сістэмы і нацыянальную спецыфіку.

Такім чынам, можна прапанаваць наступную перыядызацыю ў развіцці музычнай адукацыі на беларускіх землях:

1) музычная адукацыя ў эпоху ранняга сярэдневякоўя (V–X стст.);

2) музычная адукацыя ў эпоху сярэдняга сярэдневякоўя (XI – сярэдзіна XIII стст.);

3) музычная адукацыя ў Вялікім княстве Літоўскім (сярэдзіна XIII – XVIIIстст.);

4) музычная адукацыя ў XIX – пачатку XX ст.;

5) музычная адукацыя з 1917 г. да 1991 г.;

6) сучасная сістэма музычнай адукацыі (з 1991 г. да нашага часу).

Вызначаючы пэўныя перыяды ў развіцці музычнай адукацыі на беларускіх землях, мы ўлічвалі, што:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізацыя музычнай адукацыі ў грамадстве ў канкрэтна-гістарычны перыяд адпавядае ўзроўню развіцця музычнага мастацтва;

– музычна-педагагічная сістэма адпаведнага гістарычнага перыяду адпавядае пэўнаму мастацкаму стылю, на засваенне якога арыентавана гэтая педагагічная сістэма;

– музычная адукацыя ў кожны гістарычны перыяд выступае ў адзінстве трох асноўных кірункаў мастацтва (народнае, свецкае, рэлігійнае) і двух узроўняў здзяйснення музычна-адукацыйнага працэсу (агульная і прафесійная музычная адукацыя);

– падсістэмы агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі цесна звязаны паміж сабой, хаця і адрозніваюцца па сваіх мэтах;

– спецыфіка развіцця асноўных кірункаў і ўзроўняў музычнай адукацыі дазваляе вызначыць асноўныя гістарычныя перыяды ў яе развіцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*М.Л.Кузьмініч*

# АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Развіццё тэорыі, методыкі і практыкі агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі ў канкрэтна-гістарычны перыяд залежыць ад пануючых у грамадстве філасофскіх поглядаў на ролю і месца чалавека і музычнага мастацтва ў грамадстве; ад магчымасцей музычнага мастацтва ў выхаванні асобы ва ўмовах пэўнага грамадскага ўкладу жыцця той ці іншай краіны.

Вызначэнне асноўных этапаў станаўлення музычнай адукацыі на беларускіх землях цесна звязана з развіццём сацыяльных працэсаў, з фарміраваннем у грамадстве адносін да музычнага мастацтва як важнейшай з’явы грамадскага жыцця.

Падставай для вызначэння асноўных этапаў станаўлення музычнай адукацыі на беларускіх землях з’яўляюцца наступныя палажэнні. Музычная адукацыя – шматгранная з’ява, якая выступае як арганічнае адзінства трох асноўных кірункаў: народная музычная адукацыя, рэлігійная музычная адукацыя і свецкая музычная адукацыя. У кожным з кірункаў вылучаюцца два асноўныя ўзроўні здзяйснення музычна-адукацыйнага працэсу, якія адрозніваюцца мэтамі, глыбінёй і аб’ёмам засваення розных відаў музычнай дзейнасці, музычных ведаў, уменняў і навыкаў. Адпаведна гэтым узроўням музычная адукацыя выступае ў адзінстве дзвюх падсістэм: агульнай музычнай адукацыі і прафесійнай музычнай адукацыі; іх структурныя элементы цесна ўзаемазвязаны ў кожным канкрэтна-гістарычным перыядзе. Мэта, змест і метады музычнай адукацыі ў канкрэтна-гістарычны перыяд адпавядаюць спецыфіцы музычнага мастацтва, на засваенне якога яны накіраваны; развіццё музычна-педагагічнай думкі і практыкі звязана з развіццём музычнага мастацтва на пэўным гістарычным этапе. Працэс станаўлення і развіцця музычнай адукацыі мае свае асаблівасці ў кожным з кірункаў; істотныя змены адбываюцца і ў характары ўзаемадзеяння паміж імі не толькі ў зместавым плане, але і ў плане іх іерархічнай падпарадкаванасці.

У гісторыі Беларусі можна вылучыць наступныя перыяды сацыяльна-культурнага росту грамадства і адпаведныя ім этапы станаўлення і развіцця нацыянальнай музычнай адукацыі.

1. Эпоха ранняга сярэднявечча (V–X стст.). Славянскія плямёны засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі ў V–VII стст. У гэты перыяд

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбываюцца зараджэнне і станаўленне айчыннай мастацкай адукацыі народнай традыцыі. Вусная народная творчасць – адзін з вытокаў музычнай адукацыі – з'яўляецца спецыфічным сродкам перадачы сацыяльнага вопыту ад пакалення да пакалення. У яе традыцыйных відах адлюстраваліся адносіны народа да жыцця, нормы і правілы сацыяльных паводзін, погляды, уяўленні, перакананні. У IX–X стст. у Полацкім і Тураўскім княствах зараджаюцца традыцыі беларускай дзяржаўнасці. Хрысціянства візантыйскай традыцыі ў 988 г. становіцца афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіяй спачатку ў Кіеве, а потым распаўсюджваецца на іншыя тэрыторыі ўсходніх славян. Тым самым ствараюцца ўмовы для развіцця рэлігійнай музычнай адукацыі ў хрысціянскіх храмах.

2. XI – сярэдзіна XIII ст. У музычнай адукацыі адасабляюцца два кірункі – народнай арыентацыі і рэлігійнай (праваслаўнай) пры дамінуючай ролі апошняй. На працягу гэтага перыяду адбываюцца змены ў змесце і спосабах перадачы музычнага вопыту ад пакалення да пакалення. Узнікаюць гарады як вынік грамадскага падзелу працы і пераходу ад першабытнаабшчыннага да феадальнага ладу, як гэта назіралася ў большасці краін Еўропы. У гарадах будуюцца праваслаўныя храмы – Сафійскі сабор і Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку, Каложская царква ў Гародні, Благавешчанская царква ў Віцебску, манастыры і храмы ў Наваградку, Тураве. Адкрываюцца манастырскія школы, у якіх вывучаюць царкоўныя спевы.

3. Сярэдзіна XIII – канец XVIII ст. На беларускіх землях нараджаецца Вялікае княства Літоўскае. На развіццё беларускай музычнай адукацыі ўплывае Захад, усё больш адчуваецца арыентацыя на заходнееўрапейскія музычна-педагагічныя канцэпцыі і тэхналогіі. Шматканфесійны характар беларускага грамадства адлюстроўваўся ў суіснаванні і ва ўзаемаўзбагачэнні розных музычна-педагагічных сістэм. Выкарыстанне ў богаслужэбнай практыцы і вывучэнне партэснага шматгалосся спалучаецца з традыцыямі праваслаўнага хрысціянскага абраду. Вылучаюцца два новыя кірункі ў музычнай адукацыі з іх арыентацыяй на рэлігійна-духоўную (каталіцкую, праваслаўную, пратэстанцкую) і свецкую прафесійную музыку (асабліва ў эпохі Адраджэння і Асветы).

У 1770-я гг. Адукацыйная камісія адмяніла выкладанне рэлігіі ў межах школьных праграм. Цэнтрамі культурнага жыцця краю становяцца сядзібы магнатаў. Высокі прафесіяналізм дэманстравалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыватнаўласніцкія тэатры Радзівілаў, Агінскага, Тызенгаўза, Чарнышова, Зорыча. Гэта было абумоўлена тэатральнай адукацыяй, дзейнасцю музычных і балетных школ Слуцка, Слоніма, Нясвіжа, Гародні, Шклова. Прыватнаўласніцкі тэатр – з'ява свецкага мастацтва.

4. XIX – пачатак XX ст. У XIX ст. ішоў працэс інтэграцыі беларускіх земель у Расійскую імперыю. Адзначаны перыяд характарызуецца дамінаваннем праваслаўнай рэлігіі, працэсамі русіфікацыі, увагай да народнай культуры, пашырэннем і паглыбленнем уяўленняў аб ёй. Адбываецца пераарыентацыя на тэарэтычную распрацоўку музычна-педагагічных канцэпцый, якія адпавядаюць нацыянальнай мастацкай культуры.

5. 1917–1991 гг. – станаўленне і развіццё савецкай сістэмы агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі. Для гэтага перыяду характэрны тэарэтычнае асэнсаванне музычнага мастацтва, полiварыянтнасць поглядаў на прыроду мастацтва, суіснаванне розных музычна-стылявых сістэм у межах кожнага з кірункаў развіцця музычнай адукацыі, іх узаемадзеянне і інтэграцыя. Забяспечваецца дзяржаўная падтрымка развіцця музычнай адукацыі свецкай і народнай арыентацыі. Ствараецца шматступеньчатая сістэма агульнай і прафесійнай музычнай адукацыі ў межах СССР.

6. 1991 г. – да нашага часу. З атрыманнем дзяржаўнага суверэнітэту ў Беларусі ствараецца нацыянальная сістэма музычнай адукацыі, якая ўвабрала лепшыя традыцыі савецкай сістэмы і нацыянальную спецыфіку.

Такім чынам, можна прапанаваць наступную перыядызацыю ў развіцці музычнай адукацыі на беларускіх землях:

1) музычная адукацыя ў эпоху ранняга сярэдневякоўя (V–X стст.);

2) музычная адукацыя ў эпоху сярэдняга сярэдневякоўя (XI – сярэдзіна XIII стст.);

3) музычная адукацыя ў Вялікім княстве Літоўскім (сярэдзіна XIII – XVIIIстст.);

4) музычная адукацыя ў XIX – пачатку XX ст.;

5) музычная адукацыя з 1917 г. да 1991 г.;

6) сучасная сістэма музычнай адукацыі (з 1991 г. да нашага часу).

Вызначаючы пэўныя перыяды ў развіцці музычнай адукацыі на беларускіх землях, мы ўлічвалі, што:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізацыя музычнай адукацыі ў грамадстве ў канкрэтна-гістарычны перыяд адпавядае ўзроўню развіцця музычнага мастацтва;

– музычна-педагагічная сістэма адпаведнага гістарычнага перыяду адпавядае пэўнаму мастацкаму стылю, на засваенне якога арыентавана гэтая педагагічная сістэма;

– музычная адукацыя ў кожны гістарычны перыяд выступае ў адзінстве трох асноўных кірункаў мастацтва (народнае, свецкае, рэлігійнае) і двух узроўняў здзяйснення музычна-адукацыйнага працэсу (агульная і прафесійная музычная адукацыя);

– падсістэмы агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі цесна звязаны паміж сабой, хаця і адрозніваюцца па сваіх мэтах;

– спецыфіка развіцця асноўных кірункаў і ўзроўняў музычнай адукацыі дазваляе вызначыць асноўныя гістарычныя перыяды ў яе развіцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ